Рэг. № ____________

Установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт”

Факультэт прынттэхналогій і медыякамунікацый
Кафедра беларускай філалогіі

| | |
|---|---|
| УЗГОДНЕНА | УЗГОДНЕНА |
| Заг. кафедры | Дэкан факультэта |
| _____________В.У.Русак | _____________Т.А.Далгова |
| «___»_________ 2019 | «___» _________ 2019 |

ЭЛЕКТРОННЫ ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС
ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ

# “**ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ**”

для спецыяльнасці

1-47 01 01 Выдавецкая справа.

Складальнік:
Т.М. Федарцова – дацэнт кафедры беларускай філалогіі, кандыдат філ. навук.

Разгледжана і зацверджана на пасяджэнні
Вучэбна-метадычнага савета ___________________ 2019 , пратакол № ___

# ПАЯСНЯЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Электронны вучэбна-метадычны комплекс (ЭВМК) па вучэбнай дысцыпліне “Гісторыя беларускай літаратуры” для студэнтаў спецыяльнасці 1-47 01 01 “Выдавецкая справа” распрацаваны ў адпаведнасці з артыкулам 94 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, у адпаведнасці з Палажэннем аб вучэбна-метадычным комплексе на ўзроўні вышэйшай адукацыі, зацверджаным Пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 26 ліпеня 2011 г., № 167, Палажэннем аб электронным вучэбна-метадычным комплексе па вучэбнай дысцыпліне, зацверджаным прарэктарам БДТУ па вучэбнай рабоце 29.06.2018, у адпаведнасці з тыпавой праграмай, прызначанай для падрыхтоўкі студэнтаў, якія навучаюцца па спецыяльнасці 1-47 01 01 “Выдавецкая справа” (№ ТД – I.1265 / тып.; 2015 г.) і вучэбнай праграмай (УД-1659-І/р.ад 27.06.2014).

**Мэты ЭУМК:**

- удасканаленне навукова-метадычнага і вучэбна-метадычнага забеспячэння вышэйшай адукацыі;
- арганізацыя самастойнай працы студэнтаў;
- укараненне ў адукацыйны працэс сучасных інфармацыйных тэхналогій, якія забяспечваюць павышэнне якасці адукацыі;
- фарміраванне інфармацыйна-камунікацыйнага асяроддзя ўзаемадзеяння паміж удзельнікамі адукацыйнага працэсу.

Пры распрацоўцы ЭВМК “Гісторыя беларускай літаратуры” забяспечана выкананне ўсіх неабходных патрабаванняў: своечасовае адлюстраванне вынікаў дасягненняў навукі, паслядоўнасць і лагічнасць выкладу вучэбнага матэрыялу, рэалізацыя міждысцыплінарных сувязей, пазбяганне дубліравання вучэбнага матэрыялу, выкарыстанне сучасных метадаў навучання, рацыянальнае размеркаванне па тэмах вучэбнай дысцыпліны і вучэбных занятках, арганізацыя і метадычнае забеспячэнне самастойнай працы студэнтаў.

Комплекс скіраваны на выпрацоўку ў навучэнцаў канцэптуальнага разумення гісторыка-літаратурнага працэсу, яго адметных перыядаў і ідэйна-эстэтычных дамінант, нацыянальнай жанравай і вобразнай спецыфікі, што рэалізуецца ў мастацкіх формах адлюстравання рэчаіснасці, жанрава-стылёвых прыярытэтах.

Названая дысцыпліна не толькі адпавядае запатрабаванням часу, але і спрыяе фарміраванню прафесійнай кампетэнцыі спецыялістаў у галіне выдавецкай справы, а таксама выхаванню нашай моладзі на сістэме каштоўнасцей, якія адпавядаюць агульначалавечым прынцыпам і менталітэту беларускага народа.

ЭВМК мае сістэмны характар і выконвае наступныя **задачы:**

- садзейнічае бесперапыннай адукацыі, абапіраецца на веды і навыкі базавай школы, актуалізуе і істотна ўзбагачае іх фактычным матэрыялам, а таксама панарамнасцю бачання;

- арыентуецца на прафесійную кампетэнтнасць працы з мастацкімі тэкстамі;

- фарміруе кантэкстуальны разгляд нацыянальнага пісьменства, уменне бачыць развіццё мастацкай літаратуры праз прызму тыпалогіі, кантактаў, рэцэпцыі.

ЭВМК скіраваны на развіццё творчага мыслення студэнтаў, актуалізацыю і актывізацыю іх літаратурных здольнасцей і навукова-даследчага патэнцыялу.

**Структура ЭВМК.** Вучэбна-метадычны комплекс складаецца з чатырох узаемадапаўняльных раздзелаў: тэарэтычнага, практычнага, кантролю ведаў, дапаможнага.

*Тэарэтычны раздзел* уключае лекцыі і наступныя вучэбныя, вучэбна-метадычныя дапаможнікі:

1. Тычко Г.К. "Таямніца слова: літаратурна-мастацкая творчасць / курс лекцый"/ Г.К Тычко. – Мінск: БДУ, 2016.

2. Федарцова, Т.М. Гісторыя сусветнай літаратуры. Класіцызм. Барока. Асветніцтва. Вучэбна-метадычны дапаможнік для студэнтаў спецыяльнасці 1-47 01 01 Выдавецкая справа. − Мінск: БДТУ, 2008.

3. Федарцова, Т. М. Сусветная і беларуская літаратура XIX стагоддзя. Рамантызм. Вучэбна-метадычны дапаможнік для студэнтаў спецыяльнасці 1-47 01 01 Выдавецкая справа. − Мінск: БДТУ, 2009.

*Практычны раздзел* змяшчае матэрыялы для правядзення практычных і семінарскіх заняткаў па творах беларускай літаратуры, пачынаючы ад старажытнасці і да сённяшняга часу. Заданні для практычных заняткаў, метадычныя ўказанні:

Федарцова Т.М. Гісторыя беларускай літаратуры праграма, метадычныя ўказанні і кантрольныя заданні, – Мінск: БДТУ, 2013.

*Раздзел кантролю ведаў* уключае матэрыялы бягучай і выніковай атэстацыі: пытанні для кантролю і самакантролю вучэбна-пазнавальнай дзейнасці студэнтаў; самастойныя і кантрольныя заданні; спіс пытанняў да экзамену, тэсты:

– тэст 1 па тэме "Старажытная літаратура";
– тэст 2 па тэме "Літаратура Сярэднявечча";
– тэст 3 па тэме "Літаратура XIV–пачатку XVI ст.";
– тэст 4 па тэме "Літаратура эпохі Адраджэння"
– тэст 5 па тэме "Беларуская літаратура XIX ст."
– тэст 6 па тэме "Літаратура першай паловы XX стагоддзя";
– тэст 7 па тэме "Літаратура другой паловы XX стагоддзя";
– выніковы тэст.

*Дапаможны раздзел* складаецца з інфармацыйна-аналітычных матэрыялаў, куды ўваходзяць: вучэбная праграма дысцыпліны "Гісторыя беларускай літаратуры" для спецыяльнасці 1-47 01 01 "Выдавецкая справа" дзённай і завочнай форм навучання; спасылкі на базы дадзеных (БДТУ; вучэбныя, навуковыя, культурна-асветніцкія ўстановы Беларусі; універсальныя даведнікі); сеткавыя рэсурсы (профільныя сайты, электронныя

бібліятэкі і інш.), **спіс рэкамендаванай асноўнай літаратуры**:

1. Дасаева Т.М. Беларуская літаратура XX – пачатку XXI стагоддзя: вучэбны дапаможнік / Т.М. Дасаева.– Мінск: РІВШ, 2016.

2. Гарадніцкі Я.А. Літаратура як мастацтва: камунікатыўнасць, інтэрмедыяльнасць, наратыўнасць / Я. А. Гарадніцкі. – Мінск: Беларуская навука, 2016.

**Дадатковая літаратура**

1. Багдановіч, І.Э. Авангард і традыцыя / І.Э. Багдановіч. – Мінск, 2001.
2. Бельскі, А.І. Краса і смутак: Дапам. для настаўнікаў / А.І. Бельскі. – Мінск, 2000.
3. Гарадніцкі, Я.А. Думка і вобраз: Праблема інтэлектуалізму ў сучаснай беларускай лірыцы / Я.А. Гарадніцкі. – Мінск, 1986.
4. Гісторыя беларускай літаратуры XI – XIX стагоддзяў: у 2-х т. / Т. 1: Даўняя літаратура: XI – першая палова XVIII стагоддзя / НАН Беларусі, І-нт літ. імя Я. Купалы; навук. рэд. В.А. Чамярыцкі. – Мінск, 2006; Т. 2: Новая літаратура: другая палова XVIII– XIX стагоддзя / НАН Беларусі, І-нт літ. імя Я. Купалы; навук. рэд. У. І. Мархель, В. А. Чамярыцкі. – Мінск, 2007.
5. Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя: у 4-х т. / рэдкал.: У. В. Гніламёдаў [і інш.]. – Мінск, 1999–2003. – Т. 1 – 4.
6. Гісторыя беларускай літаратуры. Старажытны перыяд / пад рэд. М.А. Лазарука, А.А. Семяновіча. – Мінск, 1998.
7. Гісторыя беларускай літаратуры. Дакастрычніцкі перыяд: у 2-х т. / пад рэд. А. Лойкі. – Мінск, 1989.
8. Гісторыя беларускай літаратуры: XIX – пачатак XX ст.: падручнік для філал. фак. пед. ВНУ / І.Э. Багдановіч [і інш.]; пад агул. рэд. М.А. Лазарука, А.А. Семяновіча. – 2-е выд., дапрац. - Мінск, 1998.
9. Гісторыя беларускай літаратуры: XX ст. (20–50-я гады XX стагоддзя): падручнік / У.В. Гніламёдаў [і інш.]; пад агул. рэд. М.А. Лазарука, А.А. Семяновіча. – 2-е выд., дапрац. і дап. – Мінск, 2000.
10. Гісторыя беларускай савецкай літаратуры: 1941–1985 / пад рэд. М.А. Лазарука, А.А. Семяновіча. – Мінск, 1982.
11. Гніламёдаў, У. Ад даўніны да сучаснасці: Нарыс пра беларускую паэзію / У. Гніламёдаў. – Мінск, 2001.
12. Гніламёдаў, У. Класікі і сучаснікі / У. Гніламёдаў. – Мінск, 1987.
13. Лойка, А. А. Старабеларуская літаратура / А. А. Лойка – Мінск, 2001.
14. Лявонава, Е. А. Агульнае і адметнае: Творы беларускіх пісьменнікаў XX ст. у кантэксце сусветнай літаратуры / Е. А. Лявонава. – Мінск, 2003.
15. Макарэвіч, А.М. Праблема жанравых мадыфікацый у беларускай прозе XIX – пачатку XX ст. / А.М. Макарэвіч. – Магілёў, 1999.
16. Мішчанчук М.І. Беларуская літаратура XX стагоддзя / М.І. Мішчанчук, І.С. Шпакоўскі. – Мінск, 2001.
17. Мішчанчук, М.І. Літаратура беларускага замежжа: вуч. дапам. / М.І. Мішчанчук. – Мінск, 1999.

18. Саверчанка, І. Старажытная паэзія Беларусі XVI–першай паловы XVII стагоддзя / І. Саверчанка. – Мінск, 1992.
19. Семяновіч, А.А. Гісторыя беларускай драматургіі / А.А. Семяновіч. – Мінск, 1985.
20. Тарасюк, Л. Апалогія красы: Кніга пра беларускую паэзію / Л. Тарасюк. – Мінск, 2003.
21. Федарцова, Т.М. Асаблівасці літаратуры XIX стагоддзя: дапам. для студэнтаў спецыяльнасці “Выдавецкая справа” і “Філалогія” / Т.М. Федарцова. – Мінск, 1999.
22. Чамярыцкі, В. А. Беларускія летапісы як помнікі літаратуры / В. А. Чамярыцкі. – Мінск, 1969.
23. Шамякіна, Т.І. Беларуская класічная літаратурная традыцыя і міфалогія / Т.І. Шамякіна. – Мінск, 2001.
24. Шынкарэнка, В.К. Нястомных пошукаў дарога: Праблемы паэтыкі сучаснай беларускай гістарычнай прозы / В.К. Шынкарэнка. – Мінск, 2002.
25. Яскевіч, А. Падзвіжнікі і іх святыні / А. Яскевіч. – Мінск, 2001.

**Даведкавая літаратура**

1. Лазарук, М.А. Слоўнік літаратуразнаўчых тэрмінаў: дапам. для настаўнікаў / М.А. Лазарук, А.Я. Ленсу. – Мінск, 1983.
2. Макарэвіч, А.А. Кароткі літаратуразнаўчы слоўнік / А.А. Макарэвіч. – 2-е выд. – Мінск, 1969.
3. Рагойша, В.П. Паэтычны слоўнік / В.П. Рагойша. – Мінск, 1987. [і перавыданні].
4. Рагойша, В. Тэорыя літаратуры ў тэрмінах / В. Рагойша. – Мінск, 2001.
5. Рагойша, В. Тэорыя літаратуры ў тэрмінах / В. Рагойша. - Мінск, 2001.

**Рэкамендацыі па арганізацыі работы з ЭВМК.** ЭВМК “Гісторыя беларускай літаратуры” спрыяе эфектыўнай самастойнай працы студэнтаў над вучэбным матэрыялам. Комплекс рэкамендуецца выкарыстоўваць для паглыбленай распрацоўкі лекцыйных тэм, падрыхтоўкі да практычных заняткаў і экзамена, а таксама дыстанцыйнага навучання.

| Від самастойнай працы студэнтаў | Элементы ЭВМК для самостойна працы студэнтаў. |
|---|---|
| Подрыхтоўка да лекцый | Вучэбныя дапаможнікі, электронны канспект лекцый. |
| Подрыхтоўка да практычных заняткаў | Вучэбныя дапаможнікі.<br>Перыядычныя выданні (“Полымя”, “Роднае слова”, “ЛіМ”), |

| | |
|---|---|
| | выданні навуковай літаратуры. Інтэрнэт-рэсурсы. |
| Подрыхтоўка да экзамена | Вучэбныя дапаможнікі, канспект лекций, тэсты для бягучага контролю ведаў, выкананне практычных заданняў на ўзроўні самастойнай працы |

Дысцыпліна “Гісторыя беларускай літаратуры” будуецца на аснове гісторыка-храналагічнага прынцыпу, што дае магчымасць выкарыстання тыпалагічнага падыходу да вывучэння літаратуры. Пры правядзенні заняткаў ставіцца задача па магчымасці найбольш поўна ахапіць самае каштоўнае, што створана ў галіне нацыянальнага прыгожага пісьменства.

Практычныя заняткі скіраваны на выпрацоўку навыкаў аналізу мастацкіх твораў і ўменне даваць  рэдактарскі водгук на прачытаны твор.

Самастойная праца па гісторыі сусветнай літаратуры заклікана забяспечыць трывалую прафесійную матывацыю навучэнцаў, навыкі выкарыстання студэнтамі літаратуразнаўчага, даведачна-інфармацыйнага матэрыялу для вырашэння прафесійных задач.

ЭВМК укаранёны ў вучэбны працэс кафедры і выкарыстоўваецца студэнтамі другога года навучання спецыяльнасці 1-47 01 01 “Выдавецкая справа”.

ЭВМК размешчаны в СДН БДТУ, адрас спасылкі
https://dist.belstu.by/course/view.php?id=826
Памер ЭУМК 14,4 Мб.